# Васіль РАІНЧЫК

Народны артыст Беларусі, кампазітар, піяніст, кавалер ордэнаў Пашаны і Францыска Скарыны, мастацкі кіраўнік слаўтага вакальна-інструментальнага ансамбля "Верасы".



Нястомнай працай і сваім талентам Васіль Раінчык унёс вялікі ўклад у развіццё сучаснай беларускай музыкі. Імя аўтарытэтнага кампазітара вядома не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі.



На XXXI Міжнародным фестывалі мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" народны артыст Беларусі кампазітар Васіль Раінчык атрымаў узнагароду Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы за значны асабісты і творчы ўклад ва ўмацаванне беларуска-расійскіх сувязей. 2022

## 1950

Васіль Пятровіч нарадзіўся 7 сакавіка 1950 года ў вёсцы Чарапы Шклоўскага раёна. Першапачатковую прафесійную адукацыю атрымаў у дзіцячай музычнай школе Шклова. Пасля вучыўся ў Магілёўскім музычным вучылішчы і ў спецыялізаванай музычнай школе пры кансерваторыі ў Мінску.

## 1974

Скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А.В. Луначарскага двойчы: па класе фартэпіяна ў В.У. Шацкага ў 1974-м і па класе кампазіцыі ў народнага артыста СССР, прафесара Я.А. Глебава ў 1981-м. З 1974-га Васіль Раінчык — нязменны кіраўнік ВІА "Верасы".

## 1982

Васіль Раінчык стаў заслужаным артыстам Беларусі. Член Беларускага саюза кампазітараў.



Ірына Цвяткова і Васіль Раінчык разам ужо 54 гады. Ірына Міхайлаўна — паплечніца Васіля Пятровіча. Яна заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, двойчы скончыла Беларускую дзяржаўную кансерваторыю — па класе фартэпіяна прафесара М.А. Бергера (1975) і па класе кампазіцыі прафесара Я.А. Глебава (1985). Член Беларускага саюза кампазітараў. Была салісткай ансамбля "Верасы"

Высокія ўзнагароды Васіля Раінчыка: ордэн Пашаны (1986), ордэн Францыска Скарыны (2006), нагрудны знак Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" (2004), прэмія Ленінскага камсамола Беларусі (1980).

## 1995

За заслугі ў развіцці і прапагандзе беларускага музычнага мастацтва, а таксама за высокае майстэрства В.П. Раінчыку прысвоена ганаровае званне народнага артыста Беларусі.

## 1997

Адкрыццё Маладзёжнага тэатра эстрады, у якім Васіль Раінчык стаў музычным кіраўніком, а з 2000 года — мастацкім кіраўніком.

Васіль Раінчык — аўтар больш чым 120 песень, канцэрта для фартэпіяна з аркестрам, араторыі "Хлапчук-Кібальчыш" для дзіцячага хору, салістаў і сімфанічнага аркестра, сімфанічныхварыяцый, мноства камерна-інструментальных твораў, а таксама вялізнай колькасці аранжыровак, аркестровак, апрацовак, перакладанняў народнай, эстраднай, інструментальнай і электроннай музыкі. Яго песні "Марш Перамогі", "Красуй, Беларусь!", "Кветкі Перамогі" гучаць на дзяржаўных мерапрыемствах, канцэртах, парадах.



Сёння Васіль Раінчык вядомы не толькі сваімі песнямі, але і шырокамаштабнай арганізацыйнай і грамадскай дзейнасцю. Васіль Пятровіч з'яўляецца членам рэкамендацыйна-кансультатыўнага савета, створанага пры Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці.

Легендарныя "Верасы" ў Нясвіжы на мерапрыемстве, прысвечаным афіцыйнаму прыёму ад імя прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Рамана Галоўчанкі ў гонар кіраўнікоў дэлегацый дзяржаў — удзельнікаў пасяджэння Еўразійскай міжурадавай рады, 2024